вядомых матываў, сюжэтаў, вобразаў, характараў герояў, кампазіцыйных схем і інш. Аб'ектам творчага асэнсавання могуць быць фалькл., міфал. або літ. крыніцы. Так, для паэтаў 19 ст. характэрна З. сюжэтаў бел. легенд і паданняў. Напр., А.Міцкевіч, Я.Чачот і Т.Зан у якасці сюжэтнай асновы для сваіх балад выкарысталі легенду аб возеры Свіцязь. Класічным прыкладам З. з'яўляецца выкарыстанне вечных вобразаў (Дон Жуан, Праметэй, Мефістофель), вечных тэм (каханне, смерць, пошукі праўды), евангельскіх сюжэтаў, стылю («Апокрыф» М.Багдановіча). Пашыранай формай З. з'яўляецца перанясенне твора з аднаго літ. роду ў інш. (напр., інсцэніроўка «Навальніца будзе» А.Звонака паводле трылогіі Я.Коласа «На ростанях»). З. можа рэалізоўвацца таксама праз пародыю («Энеіда навыварат» В.Равінскага), стылізацыю (цыкл «Песні» М.Багдановіча), аплікацыю (верш «Светлай памяці Янкі Купалы» С.Ліхадзіеўскага). Новы твор, які з'яўляецца ў выніку З., хоць і захоўвае асн. рысы першакрыніцы, аднак заўсёды мае арыгінальны характар. У выпадку, калі аўтар творча не пераасэнсоўвае арыгінал, не змяняе яго маст. якасць, перад намі паўстаюць такія негатыўныя з'явы, як эпігонства або плагіят.

В.І.Еўмянькоў.

ЗАПАЗЫ́ЧАННЕ ў мове, пераход з адной мовы ў другую слоў, граматычных канструкцый, марфем, фанем. Самы пашыраны від моўных кантактаў, якія ўзнікаюць у выніку гандлёвага, прам., культ. ўзаемадзеяння паміж народамі. З. ўзбагачае мову, робіць яе больш гнуткай і не ўплывае на яе самабытнасць, паколькі пры гэтым захоўваецца асн. слоўнік мовы, яе граматычны лад, не парушаюцца ўнутраныя законы моўнага развіцця. Прычыны З. слоў могуць быць знешнія (пазамоўныя) і ўласна моўныя. Да знешніх адносіцца паліт., гандлёва-эканам., прам. ўплыў аднаго народа на другі. Уласна моўныя прычыны З.: патрэба ў называнні новых паняццяў, з'яў, прадметаў (*лагістыка* ад англ. *logistics* 'комплексная сістэма арганізацыі працэсу руху тавару ад вытворцы да пакупніка'; *спам* ад англ. *spam* 'масавая рассылка рэкламных аб'яў па электроннай пошце'); неабходнасць удакладніць, дэталізаваць пэўнае паняцце (*саміт* ад англ. *summit* 'тып афіцыйнай сустрэчы або нарады кіраўнікоў дзяржаў'; *снукер* ад англ. *snooker* 'від більярда, у якім выкарыстоўваюцца 15 чырвоных шароў і 6 інш. колераў, якія трэба забіць у лузы більярднага стала ў пэўным парадку'); тэндэнцыя ў мове да замены неаднаслоўных, апісальных або складаных найменняў аднаслоўнымі (*аўтарскае права — капірайт* ад англ. *copyright*; *велічыня пастаянная — канстанта* ад лац. *constan, -ntis* 'нязменны, пастаянны'); адсутнасць дакладнага наймення ў роднай мове (*віртуальны, дайджэст, інвестар, спічрайтар, спонсар, спрэй* і інш.); патрэба ў адпаведным стыліст. эфекце (*сек'юрыці* замест *ахоўнік*; *бойфрэнд* замест *хлопец-сябар*; *прэзент* замест *падарунак*); неабходнасць выражэння пазітыўных або негатыўных адценняў (параўнаем: *піўная* і *паб*, *пракат машын* і *фірма аўта-рэнтал* і інш.).

Іншамоўныя словы звычайна захоўваюць характэрныя рысы тых моў, з якіх яны запазычаны, таму іх можна адрозніць ад бел. паводле паходжання. У сучаснай бел. мове прадстаўлены: грэцызмы (*арыфметыка, афарызм, граматыка, метафара, філасофія* і інш.), лацінізмы (*акцыя, ангіна, дырэктар, калега, камедыя* і інш.), англіцызмы (*біфштэкс, блок, гольф, клуб, лорд, трамвай* і інш.), германізмы (*атэіст, гандаль, друк, кафля, кошт, фальш, цэнтнер* і інш.), галіцызмы (гал. чынам З. з франц. мовы: *авангард, афіша, балет, вадэвіль, кіно, салон* і інш.), цюркізмы (*алмаз, аршын, атаман, курган, тавар* і інш.), літуанізмы (*венцер, дойлід, клуня, крупеня, твань* і інш.), стараславянізмы (*акаянны, блаславенне, дрэва, уладыка, чало* і інш.), русізмы

(*ачаг*, *вопыт*, *вучоны*, *подзвіг*, *упраўленне*), украінізмы (*бандура*, *боршч*, *бублік*, *шкаляр* і інш.), паланізмы (*вантробы*, *дашчэнту*, *змрок*, *кавадла*, *хлопец* і інш.).

Асаблівым выпадкам З. з'яўляецца калькаванне — утварэнне новых слоў на базе бел. каранёў і афіксаў, але паводле структурных схем, уласцівых інш. мовам (англ. *skyscraper* — рус. *небоскрёб* — бел. *хмарачос*). У сучаснай бел. літ. мове прадстаўлены калькі са слоў грэч. (*alphobetos* — *азбука*; *biographia* — *жыццеапісанне*; *orthographia* — *правапіс*), лац. (*agricultura* — *земляробства*; *declinatio* — *схільнасць*; *hidrogenium* — *вадарод*), франц. (*circonstance* — *абставіны*; *impression* — *уражанне*; *journal* — *дзённік*), ням. (*augenscheinlich* — *відавочны*; *aussehen* — *выглядаць*; *Einheit* — *адзінства*), рус. (*воспитатель* — *выхавацель*; *единоличник* — *аднаасобнік*; *противоположный* — *процілеглы*) і інш. моў. Калькавацца могуць не толькі асобныя словы, але і цэлыя выразы (англ. *public relations* — *сувязі з грамадскасцю*, *root segment* — *каранёвы каталог* і інш.).

Словы, якія перайшлі ў бел. мову, адрозніваюцца па ступені асвоенасці. Некаторыя настолькі трывала ўліліся ў яе лексічную сістэму, што ўспрымаюцца як уласнамоўныя (*боршч*, *булка*, *катлета*, *малюнак*, *пінжак*, *суп*, *цукерка*, *школа*). Інш., наадварот, захоўваюць сваё «іншаземнае» аблічча і ўспрымаюцца як відавочна чужыя. Гэта т.зв. экзатычныя словы, або экзатызмы (ад грэч. *exotikos* 'чужы'), словы і выразы, якія запазычаны з інш. моў, адлюстроўваюць паняцці з жыцця інш. народаў і ўжываюцца з мэтай надаць маўленню своеасаблівы мясц. каларыт (*лаваш*, *меджліс*, *пані*, *франк*, *хурал*, *чалма*, *янычар*). Ад экзатызмаў трэба адрозніваць варварызмы (ад лац. *barbarismos*) — іншамоўныя словы, не да канца засвоеныя мовай, найчасцей у сувязі з цяжкасцямі граматычнай адаптацыі. Звычайна варварызмы выкарыстоўваюцца пры апісанні чужаземных звычаяў, побыту, нораваў, для стварэння мясц. каларыту. Яны могуць надаваць гумарыст., іранічнае, сатыр. або ўзвышанае гучанне тэксту: *Дзякую, дзякую, вашэці. Проша са мною клопату не рабіць* (Я.Купала); *На Шчары, / Нарачы, / На Свіцязі / Схаўрусіць хай / з салам алей кум. / Татары! / Множцеся й пладзіцеся, / Вы нашыя. / Салям алейкум!* (Р.Барадулін). *Д.В.Дзятко.*

«ЗАПІСКІ АДДЗЕ́ЛА ГУМАНІТАРНЫХ НАВУ́К», серыйнае навуковае выданне. Выдавалася ў 1927—30 у Мінску на бел. мове Інбелкультам і Бел. АН. У серыю ўваходзілі «Працы...» камісій, кафедраў, ін-таў Інбелкульта (кн. 1—6) і Бел. АН (кн. 7—13). Змяшчаліся матэрыялы па гісторыі, археалогіі, этнаграфіі, мастацтвазнаўстве, філалогіі і праваназнаўстве, справаздачы аб экспедыцыях і дзейнасці навук. устаноў, рэцэнзіі і бібліяграфічныя агляды. Для «Запісак...» характэрна пераважная ўвага да публікацыі даследаванняў і крыніц па гісторыі і культуры Беларусі, бел. мове. Выданне ілюстравана малюнкамі, фатаграфіямі, картамі, схемамі і планамі; змешчаны геагр. паказальнікі. Найб. цікавасць уяўляюць публікацыі А.В.Бурдзейкі, Я.Гембіцкага, Д.І.Даўгялы, М.В.Доўнар-Запольскага, В.Д.Дружчыца, С.А.Дубінскага, А.Д.Кавалені і С.С.Шутава, К.І.Кернажыцкага, У.Г.Краснянскага, М.К.Любаўскага, А.М.Ляўданскага, В.Ф.Мачульскага, К.М.Палікарповіча, У.І.Пічэты, Ц.Сцяпанава, М.М.Шчакаціхіна, А.М.Ясінскага і інш. У кн. 13 надрукавана праца У.М.Ігнатоўскага «1863 год на Беларусі. Нарыс падзей».

«ЗАПИ́СКИ СЕ́ВЕРО-ЗАПАДНОГО ОТДЕ́ЛА РУ́ССКОГО ГЕОГРАФИ́ЧЕСКОГО ОБЩЕСТВА», часопіс, орган Паўн.-Зах. аддзела геагр. т-ва. Выдаваўся ў 1910—14 у Вільні на рус. мове. Выйшлі кн. 1—4. Рэд. Д.І.Даўгяла. Асвятляў дзейнасць аддзела, змяшчаў матэрыялы па этнаграфіі, фальклоры, геалогіі, археалогіі,